## 32. БЕЛАРУСКІ ШАНЦ

Што вы робіце, калі на вашым падаконніку звялі кветкі? Берацё пасудзіну з вадой і выліваеце яе ў гаршчок з кветкамі.

Праз дваццаць мінут вы бачыце, як пруткa выпрасталася сцябло, як падняліся лісточкі, як расліна налілася зелянівам.

Што робіць калгасны аграном, калі на полі звяла бульба (або пшаніца)? Ён моліцца, каб пайшоў дождж. (У сувязі з чым мяркую, што сярод аграномаў няма бязбожнікаў.)

Калі ж бульба ці пшаніца марнеюць на меліяраваным (так званым палепшаным) полі, а дажджу няма, то дзеянні агранома тыпова наступныя: ён спяшаецца да бліжэйшага шлюза, апускае яго заслонку, спыняе ў асушальным канале адток вады. Вада каля канала разліваецца лужынай, па яе берагах бульба (пшаніца) крыху ажывае, а далей, па полі, працягвае сохнуць ад бязводдзя.

Тады аграном мацюкаецца па-руску, успамінаючы Бога, чорта і меліяратараў, і пачынае ствараць на полі як мага больш лужын. Бярэ бульдозер і засыпае канал у многіх месцах.

Іншага выйсця ў сучасных умовах не існуе: каб выратаваць ураджай, трэба зруйнаваць працу меліяратараў. Прымітыўная меліярацыйная сістэма не вымагае ад чалавека вытанчаных разваг, не песціць варыянтамі. Адна бязглуздзіца вядзе за сабой другую, а тая – трэцюю. Вясной засыпаныя каналы трэба адкопваць, каб спусціць лішак вады. Інакш каля лужын не пасееш.

Падобны ідыятызм працягваецца па ўсёй Беларусі ўжо больш за тры дзесяцігоддзі запар. На плошчы тры мільёны гектараў – столькі палёў у нас асушана і перададзена гарапашнаму аграному.

Калі ідыятызм становіцца нормай паводзінаў і дзяржавы, і грамадзян, калі ідыёцтва ператвараецца ў навуку і практыку, то, скажыце, мне, у чым заключаецца ўсеагульнае выратаванне? У ідыятызме і заключаецца. У разумным яго выкарыстанні.

У цяперашніх варунках няма ў нас нічога больш эфектыўнага, чым заставіць служыць нам ідыёцкую сістэму гаспадарання, створаную камуністамі. Толькі пры такой умове пакаленні савецкіх людзей адыдуць у нябыт з пачуццём паўнацэннасці, спраўджанасці: працавалі і змагаліся недарма.

Канкрэтна. Меліярацыйныя каналы, засыпаныя аграномам дзеля выратавання бульбы і пшаніцы, – вясной не адкопваць.

Вы спытаеце, а як тады пасеяць, калі па гразкім балоце не пусціш трактар з сеялкай? У вашым пытанні ёсць рацыя. Таму я спытаю у вас: а навошта сеяць па гразкім полі, якое нядаўна было балотам? Чаму вам так хочацца асушыць апошнюю лужыну? Выратавальную! Ці не лепш будзе пакінуць яе пасярод поля як рэзервуар штучнага дажджу, які не дазволіць пасевам загінуць?

Прадбачу вашу дасведчанасць наконт дапатопнай лужыны пасярод сучаснага тэхналагічнага поля, лужыны, якая мае намер зарасці травою, засяліцца жабамі і ўюнамі іператварыцца ў балота. Я з нецярплівасцю чакаю вашага наступнага пытання: Казловіч, завеш назад у балота?

У балота!

Адказваю вам, упершыню не тоячы радасці ад безгаспадарчасці на меліяраваных землях: іх выратуе толькі балота. Балота – выратавальная калыска беларусаў.

Нам, землякі, пашэнціла, што ў нас такія бязглуздыя меліяратары, і навукоўцы, і праекціроўшчыкі, і прарабы. Асушальная сетка, якую яны збудавалі, прыйшла ў непрыгоднасць, па ёй больш не сыходзіць ад нас вада, не выцякае з нашай зямлі спрадвечная сіла. Там, дзе каналы не паспелі перагарадзіць аграномы, там іх рэчышчы перагарадзілі алешынкі і асінкі. Безгаспадарчасць пастаралася сапсаваць каналы найлепшым чынам.

У 1972 годзе я пісаў і гневаўся, што ў Беларусі, на Мазырскім заводзе, ніяк не скляпаюць машыну, якая б магла спраўна чысціць каналы, касіць алешыны-асіны. Такія эфектыўныя машыны не прыдумалі – і каналы пазарасталі. Слава савецкай тупасці!

У 1973 годзе я як журналіст прабіваў у практыку прагрэсіўны пластмасавы дрэнаж – і не прабіў, і абураўся валакітай чыноўнікаў. У зямлю прадаўжалі похапкам класці кароценькую ганчарную трубку, якая хутка перакошвалася, заглейвалася, не прапускала ваду з Беларусі ў далёкі акіян. Слава айчыннай бюракратыі!

У 1974 годзе група сумленных вучоных звярнулася да мяне, каб дапамог праз газету расказаць пра танны, бясшкодны для прыроды метад меліярацыі – лагчынны (амаль лужынны!). Нам не дазволілі прапаганду дзедаўскага метаду. Нам сказалі, што партыя і ўрад не шкадуюць сродкаў на вызваленне беларускага народа ад балотаў.

На асушэнне адпускалі астранамічныя сумы – пакуль не давялі дзяржаву да ручкі. Астранамічная колькасць грошай патрэбная зараз, каб адрамантаваць меліярацыйную сетку. А дзе ўзяць? Добра, што няма дзе! Сённяшняе жабрацтва беларускай дзяржавы – гарантыя выратавання прыроды. Прырода, якую перасталі гвалціць, займела шанц выжыць.

Прырода мае ўласцівасць самаўзнаўляцца. У самым выгадным становішчы апынуліся занядбалыя калгасы, тыя, што забыліся глядзець за асушальнай сеткай: не касілі ў каналах, не рамантавалі шлюзы, разбуралі плугамі дрэнаж. У выніку безгаспадарчасці ў такіх калгасах не назіраецца над тарфянікамі пылавых воблакаў, не высахлі ў вёсках калодзежы, не перавялася ў навакольных азярынах і рэчках рыба, не забыліся людзі, што такое жнівеньскі туман над лугам, грыбны дождж над лесам, балотная вільгаць над полем і вільготнасць у шчаслівых чалавечых вачах ад неўміручай прыгажосці і жывучасці знаёмай з дзяцінства прыроды.

Балота абавязкова вернецца. Калі не перашкаджаць. Спецыялісты называюць гэты працэс: другаснае (паўторнае) забалочванне. Яно ў Беларусі паскараецца – у гэтым выратаванне.

Паўторнае забалочванне тэрыторыі Беларусі – вынік гісторыі БССР. І кропка! Пачынаецца гісторыя суверэннай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь. А суверэнітэт пачынаецца са стабілізацыі геаграфічнага становішча краіны і яе прыродных асаблівасцей, якімі абумоўлены нацыянальны характар.

Беларусы стагоддзямі надзвычай удала выкарыстоўвалі прыроду для надзённых патрэб. Беларусы да дваццатага стагоддзя не знішчылі сваю калыску так, як знішчылі іншыя народы: у паўночнай Афрыцы – лясы, на змену якім прыйшла пустыня; на Бліжнім Усходзе – зялёныя прадгор'і, якія ператварыліся ў голыя камяні; у паўночнай Амерыцы – прэрыі, на месцы якіх зараз сухадол...

Захаваўшы сваю калыску, беларусы, як ніхто іншы, захавалі свой менталітэт. Яго разбурэнне пачалося з дапамогай татальнай меліярацыі, што прынесла ў побыт прыбалотнага ляснога народа стэп. Гэты народ заўсёды займаўся толькі разумнай меліярацыяй, мы бачылі яе вынік на востраве Ворвочэнскэ.

Паўторнае забалочванне дае Беларусі шанц пачаць паўторную меліярацыю. Хочацца верыць, што самастойная дзяржава будзе распараджацца сваёй прыродай не так, як распараджалася БССР у статусе ўсесаюзнага свінарніка. Насцярожвае аўтарытарны прэзідэнт, які прызвычаіўся пакараць і перамагаць усё і ўсіх. А што калі возьмецца з імпэтам пакараць прыроду?

Можа, вам карціць спытаць мяне, як рабіць паўторную меліярацыю, каб было добра і прыродзе, і чалавеку?

Тады вы многа ад мяне хочаце: я павінен вас яшчэ і навучыць! Вучыць толькі прырода – у тым прытча.

1994-2005

www.kamunikat.org